Просто хорошая газета

Отдушина

12+

№11 (810) 11 марта 2020 года

Выходи[illegible]з в неделю | Основана 18 октября 2002 года | Издатель УП «Газета Слонимская» | ГАЗЕТА РЕКЛАМНАЯ ДЛЯ ДОСУГА

НАШЕ ИНТЕРВЬЮ

ОЛЕГ СКРИПКА: «Слоним очень похож на приятные западноукраинские города вроде Мукачева, Черновцов»

7 марта в Слониме впервые выступила легендарная украинская группа «Вопли Видоплясова», которая была образована в далеком 1986 году. Именно «Вопли» первыми стали петь на украинском в стиле рок.



О впечатлениях от Слонима и тура по Беларуси для "ГС" рассказал харизматичный фронтмен украинской группы Олег Скрипка.

— Пан Олег, каковы Ваши впечатления от белорусской провинции и от Слонима в частности?

— Мы сегодня въехали в Слоним и были очень впечатлены, будто мы оказались в Западной Украине. Слоним очень похож на приятные западноукраинские города вроде Мукачева, Черновцов. Также Слоним похож на польские и чешские города. Это, мне кажется, осталось с тех пор, как мы были в одном культурном пространстве. И это показывает, что мы очень близки исторически и, видимо, генетически, ведь здесь очень классные люди и нас очень хорошо принимают, как своих.

— Что успели увидеть в Слониме из достопримечательностей архитектуры?

— Красивый исторический центр, церкви. И здание слонимского театра, архитектура неординарная! И еще Дом культуры, такое эстетическое место. Эти три скульптуры железные — что-то невероятное. Нам нужно было поздравить украинских женщин с праздником 8 Марта, и мы записали видеоприветствие на фоне этих железных скульптур. Вообще, Слоним теперь один из моих любимых городов в Беларуси, он реально дуже красивый и колоритный.

— Со Слонимом связаны такие известные исторические личности, как Сапеги и Огинские. Вам что-то говорят эти фамилии?

— Про полонез Огинского, конечно, я слышал! А вот Сапеги, к сожалению нет, не припоминаю.

— У вас в репертуаре есть белорусскоязычный вариант песни «Краіна мрий». Часто исполняете эту песню?

— Во время белорусского тура с большим удовольствием исполняем эту песню на «беларускай мове». Когда-то мы её записали для проекта «Тузін Гітоў». Дуже классный проект, с удовольствием еще бы поучаствовали в подобном.

— Вам не обидно, что в Беларуси большинство населения не говорит на белорусском?

— Это исторический факт, историческое явление. Половина Украины тоже говорит по-российски. Это продукт советской системы. Советского Союза нет, а вот советский человек есть, только живет он в другой стране.

— Когда-то в 1989-м Вы с «Воплями Видоплясова» выступали на разогреве у белорусской группы «Мроя». С кем еще из белорусских артистов знакомы, общаетесь?

— Было дело! Знаком с их лидером Лявоном Вольским. Когда-то я проводил фолк-фестиваль, который назывался «Краіна мрий», и туда приглашал много групп из Беларуси, те же «Палац», «Троіца», очень классные группы. Также общаюсь с Сергеем Михалком, с ним часто пересекались на концертах и в Украине, и в России.

— В Россию после событий 2014 года вы не ездите?

— После того как началась война, конечно, больше в России не выступаем.

— Скучаете по России, по российской публике?

— Я в детстве жил в Мурманской области. А по российской публике, конечно, скучаем, нас там многие любят. Был такой момент, мы выступали на фестивале в Риге и автобусы наших фанатов из Питера и Москвы приехали на наше выступление поддержать нас. Безусловно, своя публика у нас там есть, нас помнят, многие пишут. Но в связи с политической ситуацией мы в настоящее время там выступать не будем. Многие россияне посещают наши концерты в Европе. К примеру, на наш недавний концерт в Вене приехали наши фанатки из Санкт-Петербурга, и было очень приятно. Также поддерживаем общение с некоторыми российскими артистами. Тот же рэпер Баста приезжал на праздник, посвященный нашему 25-летию, нас поздравить. Noize MC исполняет кавер-версию нашего хита «Танцы» на своих концертах.

— Когда, на Ваш взгляд, в России настанут перемены и ситуация в украинско-российских отношениях нормализуется?

— Конечно, любой конфликт рано или поздно завершается и все меняется. Вопрос только, когда это произойдет. Хотелось бы, чтобы это случилось как можно быстрее.

Никита ПАСТУХОВ

ФОТО АВТОРА

ПРОДОЛЖЕНИЕ ТЕМЫ НА С. 5 «ОТДУШИНЫ»

Пазнай сябе на фота

Паважаныя чытачы! Пазнавайце на старых фотаздымках сябе, сваіх знаёмых і блізкіх і тэлефануйце нам: 8 (01562) 29-999, 8 (029) 133-04-21 у працоўныя дні з 9:30 да 17:30. Найбольш цікавыя расповеды пра герояў здымкаў будуць надрукаваны ў газеце, а іх аўтары атрымаюць запрашальныя квіткі на спектаклі Слонімскага драматычнага тэатра.


Слонімскія камсамольцы-актывісты з ветэранамі, 1986 год

Першым на фотаздымак са слонімскага рынку адгукнуўся наш чытач Васіль Карнейчык.

— Я пазнаў на гэтым фотаздымку свайго цесця Шундрыка Уладзіміра Уладзіміравіча. Ён жыве ў вёсцы Задвор'е. Цяпер цесцю 83 гады. Нядаўна ён зламаў нагу, таму цяпер лечыцца ў нас з жонкай у Слоніме, — расказаў Васіль.

Яшчэ адзін наш чытач пазнаў на гэтым здымку іншага чалавека.

— На фотаздымку Ігнацік з вуліцы Ламаносава, ён прадаваў на рынку кошыкі. Здаецца, яго звалі Уладзімір Вікенцьевіч. Ездзіў на ровары ці на мапедзе. А кошыкі майстар плёў вельмі добрыя, — распавёў Вячаслаў Сідаровіч.

Нашы чытачы Васіль Карнейчык і Вячаслаў Сідаровіч атрымаюць запрашальныя квіткі на спектакль Слонімскага драмтэатра «Свабодны шлюб», які пакажуць у нядзелю, 15 сакавіка. Пачатак у 17.00.

Мікола КАНАНОВІЧ
ФОТА ЧЫТАЧА

КАРАТЫСТЫ КІАКУШЫНКАЙ СА СЛОНІМА ЗМАГАЛІСЯ ЗА МЕДАЛІ


Слонімскія каратысты

У суботу, 7 сакавіка, у Гродне прайшоў турнір «Вясна над Нёманам». У ім ўдзельнічала восем лепшых слонімскіх каратыстаў кіакушынкай.

Турнір, у якім змагаліся выхаванцы Дзмітрыя Максімава, сабраў каля 250 спартсменаў з Гродна, Навагрудка, Дзятлава, Гомеля, Мінска і расійскага Зеленаграда. Барацьба была сур'ёзная, а тое, што адбывалася на пляцоўцы, захоплівала відовішчам і азартам.

Удвая прыемна, што сярод залатых медалістаў ёсць і слонімец. Ва ўзроставай катэгорыі 14-15 гадоў і ў раздзеле ката ўзнагароду вышэйшай пробы здабыў Аляксей Іголкін.

Сярэбранымі прызёрамі турніру стала Валерыя Яраш, якая змагалася ў раздзеле кумітэ сярод дзяўчат 12-13 гадоў да 40 кг.

Яе сястра Вікторыя Яраш стала трэцяй ў вагавай катэгорыі да 35 кг.

Кірыл Шастакоў таксама заваяваў бронзавы медаль. Ён выступаў у вагавай катэгорыі да 30 кг сярод юнакоў 6-7 гадоў.

За крок ад п'едэстала спыніўся Арсеній Халімончыкаў, які прайграў сапернiку з Мінска.

Максім СУДЗІЛОЎСКІ

ФУТБОЛ. 1-Я ЛИГА



Встреча ФК «Слоним 2017» и ФК «Лида» завершилась безголевым миром

В субботу, 7 марта, на стадионе Слонимского УМГ матч между ФК «Слоним 2017» и ФК «Лида» закончился нулевой ничьей.

«Слоним 2017» — «Лида» — 0:0

ФК «Слоним 2017»: Шишлов (Напорко, 46), Кильманов (Ровбут, 30), Лозко (Чудук, 70 (Герасимчик, 83)), Орлов (Баль, 69), Казаков (ИНП, 68), Чудук (Кильманов, 65 (Козлов, 83)), Силинский (Курышев, 46), Гузов (ИНП, 73), Корзун (Чернодаров, 79), Влад.Берг (Спасюк, 62), Кошель (Вил. Берг, 68).

И хоть немногочисленные болельщики в данном матче не увидели забитых мячей, игра двух непримиримых соперников оставила неплохое впечатление на зрителей.

Обе команды старались проявить себя с наилучшей стороны. Поначалу мяч чаще гостил на половине поля хозяев. Но постепенно игра выравнялась. А концовка матча, скорее всего, была за слонимскими футболистами. Вышедший на замену Вильгельм Берг мог отличиться голом на 70-й минуте, а Алексей Чернодаров, заменивший Александра Корзуна, — на 85-й.

14 марта ФК «Слоним 2017» в гостях ожидает контрольный спарринг с ФК «Минск». Будет серьёзная проверка готовности команды к новому сезону.

Сергей БУЗУН
ФОТО АВТОРА

В СЛОНИМЕ ПРОШЁЛ ДЕТСКИЙ ТУРНИР ПО ШАХМАТАМ

В субботу, 7 марта, в СШ №2 Слонима завершился детский турнир по шахматам, посвящённый Дню защитника Отечества и Международному женскому дню 8 Марта.


ФОТО АТОРА

Победителем турнира стал Кирилл Блошко, который только в одной партии с Павлом Хамко сыграл вничью.

В остальных матчах он был намного сильнее своих соперников.

Вот как выглядит шестёрка лучших шахматистов турнира:

1. Кирилл Блошко — 21 очко
2. Павел Хамко — 19 очков
3. Роман Горбацевич — 17 очков
4. Кир Криушин — 16 очков
5. Пётр Журович — 13 очков
6. Пётр Герко — 9 очков

Главный судья соревнований — Валерий Медведь.

Сергей БУЗУН

ЦЯЖКАЯ АТЛЕТЫКА

Слонімскія цяжкаатлеткі выйгралі два сярэбраныя медалі

У Гродне прайшла спартакіяда ДЮСШ і СДЮШАР Гродзенскай вобласці сярод юнакоў і дзяўчат 2005 года нараджэння. На працягу чатырох дзён, з 3 да 6 сакавіка, цяжкаатлеты падымалі штангу і змагаліся за медалі.



ФОТА ДЮСШ №1 СЛОНІМА

Пераможцы

Ад Слоніма на спаборніцтва мясцовая ДЮСШ №1 накіравала васьмярых спартсменаў, але толькі двое змаглі вытрымаць канкурэнцыю і прывезці дамоў медалі.

Лепшы вынік сярод слонімскіх спартсменаў паказала Паліна Рухлевіч. У вагавай катэгорыі да 40 кг яна стала другой.

Яшчэ адна сланімчанка, Вікторыя Есімчык, якая выступала ў вагавай катэгорыі 81+, спынілася за крок ад п'едэстала.

У хлопцаў больш паспяховым стаў Данііл Барысевіч (да 89 кг), ён заняў трэцяе месца.

— Гэта спаборніцтвы, на якіх спартсмены паказалі сваю падрыхтоўку. Адны палепшылі свае вынікі, іншыя не здолелі. У прынцыпе, ёсць над чым працаваць. Будзем старацца ўдасканальваць свае трэніроўкі, — пракаментавала выступленне сваіх выхаванцаў трэнер слонімскай каманды цяжкаатлетаў ДЮСШ №1 Таццяна Барташ.

Максім СУДЗІЛОЎСКІ

ФОТОКОНКУРС «ВЕСНЫ ЛИКУЮЩЕЙ БЛАЖЕНСТВО» НАЧИНАЕТСЯ! СПЕШИТЕ УЧАСТВОВАТЬ!



Весна спускается с небес... и поэтому «Газета Слонимская» совместно со студией красоты «Жемчужина» объявляет новый фотоконкурс — «Весны ликующей блаженство».

Главное условие конкурса — запечатлеть на фото и донести миру красоту окружающей живой природы, пробуждающейся жизни, весенних чувств и эмоций, где Вы — в унисон с весной.

Мы с нетерпением ждём ваши фотографии до 30 марта.

От одного автора принимается до 3 фотографий. Обязательно укажите Ваше ФИО и контактный телефон и сопроводите свои фото названием или коротким описанием.

Фотографии принимаем на электронный адрес gs@gs.by, viber 8 029 133-04-21, сообщением в соцсетях «ВКонтакте» или «Одноклассники».

А 31 марта наш замечательный спонсор и коллектив «ГС» определят победителя, имя которого будет опубликовано в «Газете Слонимской» 1 апреля 2020 г.

Приз — сертификат от студии красоты «Жемчужина» на 50 рублей.

Юлия ТОЛКУН

Украінец танчыў на стале гукарэжысёра ў Слоніме











Украінскі гурт «Воплі Відоплясова» 7 сакавіка наведаў Слонім. А ў шэсць гадзін вечара ў цэнтры культуры і адпачынку слонімцаў чакаў доўгачаканы канцэрт. Музыкі выканалі калі двух дзясяткаў сваіх кампазіцый.

ПАЧАТАК ТЭМЫ НА С. 1 «АДДУШЫНЫ»

На памяці карэспандэнта гэта першы выпадак, калі ў горад на Шчары прыязджае ўкраінскі гурт. Тым больш такі! Алега Скрыпку разам з гуртом па праве можна назваць зоркай сусветнай велічыні. За амаль саракагадовую гісторыю свайго існавання «Воплі Відоплясова» выступалі ў многіх краінах.

У 2020 годзе яны зладзілі вялікі тур і вырашылі праехаць па гарадах Беларусі. За плячыма застаўся Брэст, Маладзечна, Мінск і інш. Слонім таксама трапіў у іх гастрольны графік. Слонімцы аказаліся ветлівымі гаспадарамі. Ужо а шостай зала пачала запаўняцца гледачамі.

На самым пачатку канцэрта, каб мець больш цесныя стасункі са сваім слухачом, Алег Скрыпка запрасіў людзей з дальніх радоў перасесці наперад, дзе свабодных месцаў было даволі шмат. Вакаліст гурта не толькі спяваў аўдыторыі свае старыя і новыя песні з сямі альбомаў, але таксама імкнуўся паразмаўляць з кожным, хто прыйшоў на яго імпрэзу. Адных ён выклікаў на дыялог, з іншымі вітаўся за руку, а трэціх нават абдымаў. Але адчувалася, што нечага не хапае. Артыст размаўляў выключна на ўкраінскай мове. Магчыма, ад гэтага людзі, што прыйшлі на канцэрт, былі асцярожныя ў сваіх эмоцыях. Сам музыка неаднаразова жартаваў, ці не пакусаў слухачоў злосны каранавірус.

Разняволіцца і выпаўзці са шкарлупіны, у якой знаходзілася зала амаль паўканцэрта, дапамаглі танцы, якія стаў паказваць артыст. Спачатку Алег Скрыпка танчыў на сцэне, а потым перайшоў у залу. Апагеем танцавальнага паказу стала поза поўнага дрэва, якую артыст выканаў проста на стале гукарэжысёра.

Ад убачанага адны агіднa крывіліся, другія былі ў захапленні, трэція пляскалі ў далоні, выкрыкваючы «брава».

Рослая фігура артыста, якая ўздымалася над натоўпам, як бы сцвярджала, што і ў пяцьдзясят з гакам ты можаш быць маладым, калі гэтага захочаш.

Без кампазіцый «Вясна» і «Танцы» слонімцы не засталіся. Іх гурт выканаў у апошняй частцы сваёй праграмы. Пад іх танцавалі ўсе, хто быў на канцэрце. Народныя песні ад «Вопляў Відоплясова» яшчэ больш распалілі слухачоў. Прапанову выйсці на сцэну і стварыць гурту падтанцоўку моладзь сустрэла на ўра.

«Ой ты, Галю», «Падманула, падвяла», «Ой, кума», «Распрагайце, хлопцы, коней» спявалі ўсе. Слонімцаў бы хто падмяніў. Гэта ўжо быў жывы арганізм, які нарэшце не баяўся паказаць тое, што было ўнутры, і быць на адной хвалі з украінскімі артыстамі.

У такія хвіліны пачынаеш разумець, што межаў паміж нашымі народамі — беларускім і ўкраінскім — не існуе.

Максім СУДЗІЛОЎСКІ
ФОТА АЎТАРА
І МІКІТЫ ПАСТУХОВА

НОВОСТИ КУЛЬТУРЫ

ЗАЖГИ ДОБРО В СВОЕМ СЕРДЦЕ

5 марта в Мижевичской участковой больнице прошел ежегодный благотворительный концерт для нуждающейся категории населения и медицинских работников.



ФОТО ИЗ АРХИВА АВТОРА

Артисты побывали в Мижевичской участковой больнице

Праздничную программу «Зажги добро в своем сердце» подготовили сотрудники Жировичской детской школы искусств, Мижевичской средней школы и Селявичского центра культуры.

Артисты порадовали зрителей разнообразными номерами.

Открыл праздничный концерт особым бисерным звучанием баяна и аккордеона инструментальный ансамбль под руководством Натальи Язневич.

Продолжили музыкальное поздравление солисты центра культуры Селявичи и руководитель Марина Габова душевными песнями.

Эмоционально и проникновенно прозвучали номера вокального ансамбля под руководством Валерии Попко.

Всех присутствующих объединило общее желание — творить добро и протягивать руку помощи тем, кто особенно в ней нуждается.

Дарья ИВАНОВА

ЭНЕРГИЯ НОВОГО ВРЕМЕНИ

В рамках международного проекта «Энергия нового времени» совместно с центром поддержки талантов (г. Москва) учителя и учащиеся структурного подразделения Мижевичи ГУО «Жировичская ДШИ», пройдя отборочный этап, участвовали в конкурсе в номинациях «академический вокал» и «инструментальное исполнительство».



ФОТО ИЗ АРХИВА АВТОРА

Победители со своими учителями

По результатам III Международного конкурса детского и юношеского творчества «Моя муза» и «Новогодняя звезда» Дарья Свита (учитель Попко Валерия Валерьевна) стала обладателем диплома лауреата III степени по двум номинациям в категории 13-15 лет (академический вокал).

Учащаяся Евгения Башко (учитель Язневич Наталья Станиславовна) в III Международном конкурсе детского и юношеского творчества «Новогодняя звезда» и «Моя муза» стала лауреатом II степени в возрастной категории 13-15 лет (инструментальное исполнительство).

Приятно удивила результатом во II Международном конкурсе детского и юношеского творчества «Ритмы Рождества» Анна Лабор (IV класс, баян) — учащаяся учителя Язневич Натальи Станиславовны. Исполнив произведение всем полюбившегося белорусского автора С. Л. Гардейчик, Анна Лабор стала лауреатом I степени в своей возрастной категории.

Особую благодарность выражаем родителям учеников за поддержку, укрепление мотивации к обучению и возможность реализации поставленных целей.

Дарья ИВАНОВА

Лунный календарь на март 2020 года



10 (с 13:04 вторник)-12 (до 12:29 четверг) марта Луна в Весах (Дни Цветка, стихия воздух, Луна нисходящая). Нейтральный знак.

Сутки после ПОЛНОЛУНИЯ (10 марта до 20:47) не рекомендуется посев семян на рассаду и пересадка комнатных растений. Далее наступает благоприятный период для посева и посадки овощных, зеленных и цветочных культур в домашних условиях или в обогреваемых теплицах. Полив нежелателен.

12 (с 12:29 четверг)-14 (до 14:10 суббота) марта Луна в Скорпионе (Дни Листа, стихия вода, Луна нисходящая). Плодородный и влажный знак.

Благоприятное время для посева на рассаду детерминантных сортов томатов, посева зеленных культур для выращивания в обогреваемых теплицах или на подоконнике. Идеальный период для посева мицелия грибов. Рекомендуется проведение полива овощных и цветочных культур с одновременной подкормкой органическими удобрениями. Проверьте условия хранения семян и другого посадочного материала. При необходимости посейте семена для проверки их на всхожесть. Нежелательно: проведение мероприятий по борьбе с вредителями.

14 (с 14:10 суббота)-16 (до 19:27 понедельник) марта Луна в Стрельце (Дни Плода, стихия огонь, Луна восходящая – узловой пункт). Малоплодородный знак.

Можно посадить лук репчатый, чеснок, корнеплоды столовой свеклы, сельдерея и петрушки на выгонку в домашних условиях, посеять зеленные культуры, пряные и лекарственные травы. Эффективны мероприятия по борьбе с вредителями и болезнями комнатных растений.

16 (с 19:27 понедельник)-19 (до 04:17 четверг) марта Луна в Козероге (Дни Корня, стихия земля, Луна восходящая). Умеренно плодородный знак.

Период подходит для посева редиса и зеленных культур в обогреваемых и необогреваемых теплицах, посадки овощных культур на выгонку в домашних условиях (лука репчатого, свёклы столовой, сельдерея корневого, петрушки корневой). Благоприятный период для пикировки растений, подкормки органическими удобрениями. Займитесь приготовлением (приобретением) почвогрунтов для посева семян и посадки растений. Эффективны мероприятия по борьбе с вредителями комнатных растений, обитающими в земле.

19 (с 04:17 четверг)-21 (до 15:34 суббота) марта Луна в Водолее (Дни Цветка, стихия воздух, Луна восходящая). Неплодородный знак.

Посев, посадка и пересадка любых культур не рекомендуется. Полив в Водолее может привести к загниванию корней, при подкормке легко сжечь растения. Благоприятный период для уборки, благоустройства, украшения участка, дачи. Проследите за режимом хранения овощей. При необходимости проведите первичное снятие зимней защиты с теплолюбивых растений.

21 (с 15:34 суббота)-24 (до 03:59 вторник) марта Луна в Рыбах (Дни Листа, стихия вода, Луна восходящая). Плодородный и влажный знак.

Благоприятный период для посева на рассаду детерминантных сортов томатов, пересадки комнатных растений, посева зеленых культур в обогреваемых и необогреваемых теплицах, замачивания семян для проращивания, посева мицелия грибов. Рекомендуется полив и проведение подкормок рассады и комнатных растений жидкими органическими удобрениями, посев семян для проверки их на всхожесть.

24 (с 03:59 вторник)-24 (до 12:28 вторник) марта Луна в Овне (Дни Плода, стихия огонь, Луна восходящая). Неплодородный знак. 24 марта (12:28 вторник) – НОВОЛУНИЕ.

Сутки до НОВОЛУНИЯ не стоит ничего сеять, сажать и пересаживать!

Растущая Луна

24 (с 12:28 вторник)-26 (до 16:38 четверг) марта Луна в Овне (Дни Плода, стихия огонь, Луна восходящая). Неплодородный знак.

Не стоит ничего сеять и сажать! Полив только в случае необходимости. Займитесь наведением порядка в саду и огороде, обрезкой сухих веток, раскорчевкой старых и больных деревьев и кустарников.

26 (с 16:38 четверг)-29 (до 04:39 воскресенье) марта Луна в Тельце (Дни Корня, стихия земля, Луна восходящая). Плодородный знак.

Благоприятный период для посева овощных, пряных и цветочных культур на рассаду. Лучшие дни для посадки и пересадки комнатных растений, посева мицелия грибов, подготовки почвенных смесей для проращивания семян, закладки семян раннего картофеля на яровизацию. При необходимости проведите полив комнатных растений.

29 (с 04:39 воскресенье)-31 (до 14:44 вторник) марта Луна в Близнецах (Дни Цветка, стихия воздух, Луна нисходящая – узловой пункт). Бесплодный и сухой знак.

Неблагоприятный период для посадочных работ. У посеянных растений будет неустойчивый стебель, урожай окажется минимальным. Период подходит только для посадки и пересадки декоративно-цветущих кустарников, вьющихся и ампельных растений, земляники садовой (клубники). Полив нежелателен. Луна в знаках Воздуха благоприятна для уборки, благоустройства, украшения дома, дачи, участка.

31 (с 14:44 вторник)-31 (до 23:59 вторник) марта Луна в Раке (Дни Листа, стихия вода, Луна нисходящая). Плодородный и влажный знак.

Один из самых продуктивных знаков. Лучшее время для посева на рассаду детерминантных сортов томата, огурцов, многолетних и однолетних цветов, капусты ранних сортов, зеленных культур. Благоприятные дни для проверки семян любых культур на всхожесть, яровизации раннего картофеля. Растения в это время хорошо усваивают воду, рекомендуется проведение полива и подкормка растений минеральными удобрениями. Нежелательно применение средств защиты растений.

Александр ИВАНОВИЧ

ТЕФТЕЛИ ИЗ ГЕРКУЛЕСА В ТОМАТНОМ СОУСЕ



Тефтели из геркулеса в томатном соусе — это очень вкусная альтернатива мясным тефтелям.

Ингредиенты

Сок томатный 400 мл
Вода 400 мл
Хлопья овсяные геркулес 300 г
Луковица 1 шт.
Нерафинированное подсолнечное масло 3 ст. л.
Перец черный молотый по вкусу
Соль 1 ч. л.
Петрушка (зелень) для подачи

Приготовление

300 г овсяных хлопьев всыпать в миску.

Залить 400 мл кипятка и оставить набухать на 20 минут.

Мягкие хлопья перемешать.

Луковицу мелко нашинковать и обжарить в 3 столовых ложках натурального подсолнечного масла.

В миску с хлопьями добавить черный молотый перец по вкусу и 1 чайную ложку соли.

Добавить обжаренный лук. Хорошо перемешать массу. Руками сформировать тефтели и выложить в сковороду.

Залить 400 мл томатного сока, посолить по вкусу.

Посыпать тефтели мелко нашинкованной зеленью.

Томить на медленном огне под крышкой 20 минут.

Тефтели из геркулеса в томатном соусе готовы. Можно подавать к столу.

Овсяные хлопья зарядят энергией на долгое время и подарят белок и клетчатку, необходимые организму. Идеально для детей и полезно для взрослых.Приятного аппетита!

kedem.ru

ЛУКОВЫЕ КОТЛЕТЫ «ВКУСНО ДО СЛЁЗ»



Ингредиенты

Лук репчатый 0,5 кг
крупа манная 100 г
чеснок 3 зубчика
яйца 3 шт.
сок томатный 1,5 стакана
перец черный и соль по вкусу

На вкус как с мясом! Это очень быстро, безумно вкусно и практически даром! Если вдруг в холодильнике почти нет продуктов, вы устали на работе, но вам срочно нужно приготовить на ужин что-нибудь вкусненькое, посмотрите этот рецепт. И особенно он актуален весной, когда вы понимаете, что осенью закупили слишком много лука на зиму. Эти котлетки очень напоминают мясные тефтели. Еще никто по вкусу не определил, из чего они.

Чистим и моем лук. Готовимся немного поплакать (но чтобы не лить слезы, можете приоткрыть окно или включить вытяжку). Режем мелко лук. Лук в эти котлетки нужно именно резать. Не на терке, не через мясорубку! Плачем, но режем! Измельчаем чеснок. В миску с нарезанным луком добавляем манную крупу, яйца, измельченный чеснок, соль и черный перец. Тщательно перемешиваем. Оставляем минут на 10. Лук немного пустит сок, а манка слегка разбухнет.

Формируем котлетки. И выкладываем на сковороду. Никакая панировка не нужна. Котлетки хорошо лепятся и не разваливаются. Жарим на подсолнечном масле до золотистой корочки.

Слегка «прожариваем» томатный сок на сковороде. Заливаем котлетки томатной подливой. Ставим на медленный огонь на 15 минут. За это время манная крупа хорошенько разбухнет. Котлетки станут нежными на вкус. Украшаем блюдо перед подачей на стол. Приятного аппетита!

www.mmenu.com

ШЛЯХ ДА БОГА

Я б у семінарыю пайшоў...



Семінарысты

На календары — сакавік. А гэта значыць, што засталося зусім трохі часу, калі прагучыць апошні званок і сённяшнія 11-класнікі будуць спрабаваць свае сілы на ўступных іспытах у абраныя ўніверсітэты або каледжы.

І няхай час яшчэ ў запасе маецца, але ўжо цяпер перад імі стаіць няпростая задача — зрабіць выбар будучай прафесіі і вызначыцца з установай, у якой змогуць працягнуць далейшае навучанне.

Мінская духоўная Семінарыя — гэта вышэйшая навучальная ўстанова і да нядаўняга часу заставалася адзінай, дзе рыхтавалі будучых святароў і царкоўных служак (рэгентаў, чытальнікаў, псаломшчыкаў, алтарнікаў). Яна была адчынена ў 1989 годзе і з тых часоў застаецца роднай альма-матар для духавенства ўсёй рэспублікі. Пасля адраджэння семінарыі ў 1992 годзе ў розныя гады курыравалі адукацыйны працэс епіскап Канстанцін (Гаранаў) (цяпер архіепіскап Курганскі і Шадрынскі), архімандрыт Леанід (Філь) (цяпер епіскап Рэчыцкі), архімандрыт Іаасаф (Марза). Цяпер рэктарам семінарыі з`яўляецца архіепіскап Навагрудскі і Слонімскі Гурый.

Лічыцца, што абавязковай умовай паступлення ў семінарыю з`яўляецца паходжанне з сям`і святара. Гэта міф, які дайшоў да нас са спрадвечных часоў, калі святарства з`яўлялася класавым саслоўем і навучаліся ў семінарыях выключна папоўскія дзеці. Вялікая частка студэнтаў семінарыі — выхадцы са звычайных сем`яў, якія прыйшлі ў семінарыю, як яны часта кажуць, «па закліку сэрца». Рашэнне прысвяціць сваё жыццё служэнню царкве, пры гэтым не абавязкова ў сане святара, кіруе многімі, хто прыходзіць сюды.

Часта, скончыўшы навучальную ўстанову, чалавек яшчэ доўгі час не адважваецца станавіцца пастырам — нясе служэнне на вызначаным кіруючым архірэем прыходзе. Вядома, для «пападзюкоў», як завуць самі семінарысты дзяцей са святарскай сям`і, прасцей і лягчэй паступіць. Гэта звязана з тым, што веды закладваюцца з маленства, да таго ж, а гэта немалаважна, бацьку-святару прасцей прыглядзець за сваім дзіцем пры падрыхтоўцы да паступлення, чым за чужым. Ды і калі простага чалавека могуць не ведаць, то святара (а тым больш благачыннага) у епархіі добра ведаюць. Дарэчы, папоўскіх дзяцей і адлічваюць радзей, чым дзяцей з простай сям`і.

Наступным міфам з`яўляецца тое, што ўсе семінарысты толькі і робяць, што моляцца і выконваюць пост. Гэта не зусім так. Пост і малітва прысутнічаюць у адведзены ім час, але львіную частку ўсё ж складае адукацыя, а дакладней, самаадукацыя. Кожны студэнт ведае не па чутках, што таго, што даюць ва ўстанове, было б недастаткова без жадання самога чалавека паглыбіць і пашырыць свой кругагляд. Вось чаму за набыццё ведаў тут, у сценах семінарыі, вядзецца барацьба. Сорак дысцыплін выкладаецца кандыдатамі, дацэнтамі, дактарамі багаслоўскіх навук не толькі нашай рэспублікі, але і блізкага і далёкага замежжа.

ПРАЦЯГ БУДЗЕ

Максім СУДЗІЛОЎСКІ
ФОТА АЎТАРА

Чужая мама

— Дзе ты цягаешся?! Пакінула дома малых сірот і павалаклася ў свет як у капейку! — бабка Сымоніха з апошніх слоў лаяла Алену Канаплянскую, сустрэўшы яе на вуліцы раённага гарадка. — Цяперся прапала, і ніхто не ведае куды. Май на дварэ, людзі агароды садзяць, а ёй нічога не патрэбна... Сынкоў тваіх Вову і Дзіму хацелі забраць у дзіцячы дом, ды сястра Францішка не дала. Апякунства над імі аформіла.

— У яе і жывуць?

— Анягож пад плотам сядзяць, нелюдзь ты. Канечне, у яе. І накормлены, і апрануты. Ты ж як павалаклася больш за два гады таму назад, то ні слыху ні дыху. А Францішка Вову і чытаць вучыць, бо яму ж восенню ў школу. Ды і Дзімачку незадоўга, чатыры з паловай гадкі мае. Ужо і забыліся пэўна, якая ты ёсць...

Бабка Сымоніха паправіла за плячамі рукзак з пакупкамі і з пагардай агледзела былую суседку. Яе худая постаць была нібы вешалка для старой курткі, відаць з чужога пляча. Горача, а яна зашпілена па ўсе гузікі, бо, мабыць, не было блузачкі. Доўгая спадніца брудная і ў некаторых месцах пабіта на дзіркі.

— Дажылася... — толькі і мовіла Сымоніха.

— Ці трэба дзівіцца? Як мой Антось памёр, то для мяне і сонца перастала свяціць. Тады і ўлягла ў гарэлку, пра ўсё забылася.

— Цьфу на цябе, нягодніца! Забылася яна пра ўсё! Упусцілася ў сабачую скуру, то і забылася. А як пасля вайны ўдовы пазаставаліся? Мелі і па пяцёра, і па больш дзяцей, але ж гэтак брыдка сябе не паводзілі. Працавалі, дзяцей гадавалі. А цяпер і жывецца добра, дык табе сонца перастала свяціць. Ідзі прэч, каб я цябе не бачыла!

Яны разышліся хто куды.

А праз тры дні на вуліцы вёскі Церамша з`явілася абарванка-бамжыха. У руках цяляпаўся аблезлы цэлафанавы пакет, на дне якога боўталася бутэлька з віном і ляжаў кулёк танных цукерак. Яна падышла да хаты Францішкі Вярбінскай і ўбачыла, што на надворку гуляюць два хлопчыкі — яе сыночкі. Стала ля варот, але малыя не звярталі на яе ўвагі. Апрануты ў лёгенькія маечкі зялёнага колеру і ў аднолькавыя сінія шорцікі. Белагаловыя, з поўненькімі ружовымі шчочкамі, яны не выглядалі няшчаснымі сіротамі.


МАЛЮНАК ЯЎГЕНА ІВАНОВА

Алена доўга ўглядалася ў тварыкі малых, але ні шкадавання, ні роспачы не было ў яе вачах. Спяшалася. Трэба было хутчэй пахмяліцца, бо ў галаве гудзела і балела яна так, што, здавалася, зараз лопне.

— Дзеці, хадзіце сюды, я вам цукерак дам... — дастала з пакета кулёк.

— Не трэба... Мы ад чужых нічога не бяром...

— Дык я ж ваша мама...

— Не ты наша мама! Нашу маму завуць Францішка, — сказаў Вова. — А ты чужая мама...

Хлопчыкі кінулі гульні і пабеглі ў хату. Неўзабаве на ганак выйшла сястра.

— Ну і чаго табе тут трэба?

— На дзяцей прыйшла паглядзець, а яны мяне нават не пазналі...

— Нічога дзіўнага. Столькі гадоў не была, вось і не пазналі. Прашу цябе, Алена, не цягайся сюды, не вярэдзь душу. Жыла без нас, то і далей жывi. У мяне няма другой сям`і, ні мужа, ні дзяцей, так што яны мне самыя родныя. Люблю іх і шкадую.

— А мне ж куды ісці?

— Туды, дзе была. Свет вялікі...

Алена дастала з пакета бутэльку віна, адкаркавала і тут жа выпіла палову. Астатняе заткнула коркам і паволі пасунулася ў канец вёскі. Людзі казалі, што яна потым спала ў алешніку каля рачулкі. І знікла... Ніхто не ведае куды.

Мінулі гады. Францішка выгадавала хлопчыкаў, вывучыла. Вова стаў інжынерам і працаваў у Маладзечне, а Дзіма стаў фельчарам і вярнуўся ў родную вёску, якая цяпер стала аграгарадком. Ён меў дабротную кватэру, у якую забраў Францішку. Яна доўга хварэла і памерла напрадвесні. Дзімава жонка Каця — выхаванка дзіцячага дома — была настаўніцай. Пяцігадовы сынок Васілёк хадзіў у дзіцячы садок.

Аднойчы ў нядзелю, калі над Церамшой звінела лета, сюды прыйшла бамжыха. Была яна старая, сагнутая ў кручок. Апранута ў аблезлую рудую сукенку, на галаве сівыя, даўно не мытыя патлы. Малы Васілёк убачыў яе непадалёку ад свайго катэджа. Ён бег да таты, якога выклікалі на работу. Мама займалася хатнімі справамі.

Сустрэўшы гэту дзіўную старую, спыніўся.

— Ты Баба Яга? — спытаў зацікаўлена.

— Не, я не Яга. А чый жа ты, такі прыгожанькі?

— А я Васіль Дзмітрыевіч Канаплянскі, — сур`ёзна вымавіў малы.

— А куды бяжыш?

— Да таты на работу. А мама дома. Пайшлі да нас, пакажу ёй цябе. Можа, згодзіцца пусціць да нас жыць, бо ва ўсіх дзяцей ёсць бабулі і дзядулі, а ў мяне няма.

Сваёй маленькай пухленькай ручкай хлопчык узяў старую за худую, амаль празрыстую руку і павёў дадому.

— Я прывёў нам бабулю! — крыкнуў з парога маладзіцы, што на верандзе перабірала нейкія зёлкі. Ад іх наўкола разносіўся дзіўны пах. — У нас жа няма бабулі, то няхай будзе хоць такая.

Сказаў і зноў пабег да таты, абрадаваць, што ён знайшоў ім бабулю.

У Дзмітрыя Антонавіча было шмат работы, і ён выбраўся дадому толькі пад вечар. Зайшоўшы ў кватэру, убачыў, што за сталом сядзіць жонка і нейкая незнаёмая бабка. Да гэтага часу Каця памыла старую ў лазеньцы, апранула ва ўсё чыстае, падстрыгла доўгія космы, якія ўжо збіліся ў лямец.

— Сынок! — падхапілася з табурэткі Алена і ўпала перад Дзмітрыем Антонавічам на калені. — Даруй!

Ён, здзіўлены, не мог адвесці погляду ад маршчыністага твару, ад вачэй, з якіх градам каціліся слёзы.

— Яна будзе жыць у нас! — радасна паведаміў Васілёк.

— Добра... — толькі і змог вымавіць Дзмітрый Антонавіч...

Леанарда ЮРГІЛЕВІЧ

Афиша

Слонимский драмтеатр

15 марта, воскресенье

Спектакль для детей «Поющий поросёнок». Начало в 12.00. Цена 4 руб.

Спектакль для взрослых «Свободный брак». Начало в 17.00. Цена 6 руб.

Слонимский центр культуры

11 марта, среда

Конкурсная программа «Мистер и мисс колледж» среди учащихся Слонимского медколледжа, начало в 18.00

12 марта, четверг

Праздничный концерт «Дарите женщинам цветы!» (открытое заседание любительского объединения для пожилых людей «Надежда»), начало в 12.00

Кинозал

11 марта, среда

11.00, 14.30 «Вперёд» 3D (США, 6+, мультфильм, 1.42)

12.45 «Удивительное путешествие доктора Дулиттла» 3D (12+, семейный, 1.41)

21.30 «Остров фантазий» 2D (США, 16+, ужасы, 1.49)

12 марта, четверг

12.00, 14.00 «Вперёд» 3D (США, 6+, мультфильм, 1.42)

16.00, 18.00 «Бладшот» 2D (США, 16+, фантастика, 1.49)

20.00 «Остров фантазий» 2D (США, 16+, ужасы, 1.49)

13 марта, пятница

12.00, 14.00 «Вперёд» 3D (США, 6+, мультфильм, 1.42)

16.00, 18.00 «Бладшот» 2D (США, 16+, фантастика, 1.49)

20.00 «Остров фантазий» 2D (США, 16+, ужасы, 1.49)

14 марта, суббота

12.00, 14.00 «Вперёд» 3D (США, 6+, мультфильм, 1.42)

16.00, 20.00 «Бладшот» 2D (США, 16+, фантастика, 1.49)

18.00 «Остров фантазий» 2D (США, 16+, ужасы, 1.49)

15 марта, воскресенье

12.00, 14.00 «Вперёд» 3D (США, 6+, мультфильм, 1.42)

16.00 «Остров фантазий» 2D (США, 16+, ужасы, 1.49)

18.00, 20.00 «Бладшот» 2D (США, 16+, фантастика, 1.49)

Главный редактор Николай Николаевич Кононович

Учредитель
Виктор Владимирович ВОЛОДАЩУК

Телефоны редакции:
Velcom: 8-029-133-04-21
факс: 8 (01562) 2-90-00
звонить с 9.00 до 18.00
Skype — gazslon

Регистрационное удостоверение №65 от 05.03.2009 года выдано Министерством информации Республики Беларусь. Свидетельство о госрегистрации УП "Газета Слонимская" ЮКЛ № 001845, выданное Гродненским областным исполнительным комитетом от 03.04.2003 г.

Авторы опубликованных материалов отвечают лично за подбор и достоверность фактов, их точка зрения может не совпадать с мнением редакции. Редакция не ведет переписки с читателями и оставляет за собой право не рецензировать и не возвращать рукописи. Редакция не несёт ответственности за содержание рекламы.

Тираж номера 3010 экз.

Время подписания к печати по графику 10 марта 2020 года 17:00

Объем — два условных печатных листа.
Газета отпечатана в ГОУПП "Гродненская типография", Гродно, ул. Полиграфистов, 4. индекс 230025
ЛП №02330/39 от 27.03.2014
Заказ № 1290

ISSN 1991-3362



ГАЗЕТА ВЫХОДИТ НА РУССКОМ И БЕЛОРУССКОМ ЯЗЫКАХ

Для корреспонденции: 231799, г. Слоним, ул. Красноармейская, д.41
Юридический адрес: г. Слоним, ул. Красноармейская, 41

Свободная цена

РЕКЛАМНАЯ СЛУЖБА
8(044) 715-90-03
8(044) 762-48-39; 8(044) 715-90-03
ул. Красноармейская, 41
e-mail: gs@gs.by, gazslon@gmail.com

Распространяется с газетой "Газета Слонимская" по подписке и в розницу по Республике Беларусь

